Раздзел 2.

# УДАСКАНАЛЕННЕ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ. РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ РАБОТНІКАЎ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

В.М. Іўчанка,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, прафесар кафедры гуманітарных дысцыплін
ДУА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»,
выкладчык ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

## Структурныя кампаненты адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дарослых у сферы культуры: праблемна-даследчы патэнцыял

Новыя рэаліі трансфармацыі грамадства ў дынамічна зменлівым свеце маюць патрэбнасць у глыбокім асэнсаванні і старанным абдумванні перспектыў развіцця сістэмы дадатковай адукацыі дарослых. У нестабільным сацыякультурным кантэксце спецыялістам сферы культуры неабходны хуткая адаптацыя да новых умоў, выяўленне прыярытэтаў у прафесійнай дзейнасці, выпрацоўка новых ідэй, укараненне сучасных тэхналогій і стварэнне адметных форм культурнай дзейнасці. Гэта прадугледжвае здольнасць стратэгічна мысліць, творча падыходзіць да працы, уменне бачыць шырокую панараму культурнай дзейнасці і ўсведамляць сябе рэальным суб’ектам культурнага працэсу. Невыпадкова адна з задач сістэмы дадатковай адукацыі дарослых — прывесці слухачоў да разумення інтэнцыі сучаснай свядомасці да абнаўлення — творчай і ўніверсальнай самарэалізацыі, партнёрства, узгодненасці сумесных дзеянняў і неабходнасці быць саўдзельнікамі ў агульнай справе фарміравання культурнай прасторы як каштоўнасці і нацыянальнага набытку.

Трэба ўсвядоміць, што нават дасканалая мадэль новага эканамічнага механізму і сацыяльныя рэформы не змогуць эфектыўна функцыянаваць без актыўных, таленавітых, самаадданых, адказных і прафесійна падрыхтаваных спецыялістаў.

Варта адзначыць, што большасць праграм навучання ў сістэме дадатковай адукацыі дарослых накіраваны на практыкаарыентаваную дзейнасць. Цалкам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зразумела, што спецыялістам сферы культуры патрабуюцца пастаянныя кантакты з калегамі, абмен і абагульненне вопыту канкрэтнай культурнай дзейнасці ў рэгіёнах. Але гэтага недастаткова, неабходны таксама і шырыня погляду, уменне думаць творча і ствараць культурную атмасферу, разбірацца ў інфармацыйных патоках, хутка прыстасоўвацца да навакольнага асяроддзя з дынамічным рытмам.

Дзейнасць сучаснага прафесіянала павінна насіць пераўтваральны і прагнастычны характар і абапірацца на веданне не толькі лакальнай, рэгіянальнай культуры, але і на агульныя ўяўленні, сучасныя трэнды развіцця нацыянальнай культуры ў кантэксце дасягненняў сусветнай культуры і чалавечай цывілізацыі.

Мэтанакіраванае фарміраванне кадраў у сферы грунтуецца на стварэнні культурных (тэарэтычных, метадалагічных) асноў, дзе вядучую ролю адыгрывае гуманітарны складнік (культуралагічны, сацыялагічны, эстэтычны, этычны, псіхалагічны, філасофскі, гістарычны і інш.). Важным метадалагічным аспектам для разумення функцыянавання і развіцця культуры з'яўляецца захаванне культурнагістарычнай матрыцы, бо гэта — жывая сіла, струмень адзінай энергіі нацыі і яе эліты, сацыяльна-культурны вопыт, традыцыі народа і яго культурная спадчына з усімі духоўна-культурнымі цывілізацыйнымі дасягненнямі, якія вызначаюць інтарэсы, нормы, каштоўнасці, ідэалы, мэты і перспектывы быцця нацыі. Яе разбурэнне вядзе да страты культурнага суверэнітэту і дэградацыі асноў жыццядзейнасці [1, с. 5].

Захаванне культурнай самабытнасці і разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення патрабуе бачання гістарычнага гарызонту нацыі і ўмацавання дзяржаўнасці. Далучэнне да духоўнай традыцыі народа, маральна-этычных і эстэтычных каштоўнасцей беларускай культуры — шлях да духоўна-маральнага ўзрастання і захавання духоўнай бяспекі дзяржавы. Любое канкрэтнае мерапрыемства павінна разглядацца ў кантэксце ўніверсальных і лакальных канструкцый «чалавечага» і ідэі культуры як самавыхавання, пастаяннага павышэння чалавечай «якасці», перспектыў духоўнай эвалюцыі соцыуму і асобы. Менавіта культура — база фарміравання цэласнага, універсальнага, гуманістычнага светаўспрымання як фундаментальнай асновы светапогляду. Тут важны ідэалагічны складнік як неабходны кампанент светапогляду, які ўключае ў сябе, акрамя сацыяльных аспектаў, рэфлексію адносін да прыроды, культуры, свету ў цэлым і месца чалавека ў ім у пэўны гістарычны перыяд развіцця. Важна веданне і разуменне спецыфікі ўспрымання свету беларусамі, іх светаадчуванне, светаўспрыманне Космасу, Бога, Прыроды, Чалавека.

Ядром традыцыйнай культуры беларусаў з'яўляецца народная філасофія, дзе ўжо закладзена асаблівасць успрымання і светаразумення навакольнай светабудовы. І гэта транслiравалася ў лад жыцця беларусаў і імпліцытна змяшчаецца ў народным мастацтве, складае аснову нацыянальнай культуры. Усё гэта — неабходны кампанент культуры, які непарыўна звязаны з канкрэтнай практычнай дзейнасцю. Чалавек, як і нацыя, з'яўляецца суб'ектам культурнага працэсу, выконвае сваё прызначэнне ў свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Духоўная, творчая праца асобнага чалавека і нацыі ў цэлым вызначае будучыню краіны і яе народа. Адсюль выхад да актыўнай дзейнасці па захаванню культурнай пераемнасці і традыцый, развіццю новых форм беларускай культуры, пашырэнню публічнай прасторы шляхам актывізацыі партнёрства з грамадскімі арганізацыямі і супольнасцямі. Адной з мэт дзейнасці можа быць ператварэнне культурных паслуг сферы народнай творчасці, нацыянальнай культуры і мастацтва ў сімвалічныя кампаненты цэласнага жыццёвага стылю і нацыянальнага ладу жыцця, гэтак жа як раскрыццё і выкарыстанне рэсурсаў нацыянальнай культуры ў фарміраванні пазітыўнага іміджу Беларусі. Не трэба забываць, што менавіта спецыялісты сферы культуры фарміруюць устойлівы інтарэс да гісторыка-культурнай спадчыны. У сваю чаргу, гэта спрыяе фарміраванню гістарычнага мыслення і памяці. Тут канцэнтруюцца праблемы ідэалагічнага, экалагічнага і патрыятычнага выхавання моладзі, ствараецца вобраз краіны з унікальным ландшафтам (лес, азёры і рэкі, балоты), аўтэнтычным фальклорам і традыцыйнай культурай, складанай гісторыяй і самабытнай культурай. Існуе магчымасць з'яўлення новых ініцыятыў і праектаў, звязаных з прасоўваннем традыцыйнай культуры і мастацтва ў інфармацыйна-камунікатыўную прастору, рэпрэзентацыяй беларускай культуры і культурных каштоўнасцей.

Вопыт выкладання і зносін са спецыялістамі сферы культуры паказвае, што яны разумеюць значнасць тэорыі культуры і актуальных даследаванняў сучасных праблем яе развіцця. Напрыклад, групы слухачоў — спецыялістаў кінапракатных арганізацый, музейных работнікаў, рэжысёраў народных тэатраў — з вялікай цікавасцю ўспрымаюць змест адукацыйных праграм, заснаваных на выяўленні прыкладных праблем фарміравання аўдыторыі тэатраў, кінавідовішчных прадпрыемстваў, работы з наведвальнікамі музеяў, пабудаваных на матэрыялах сацыялагічных даследаванняў [2, с. 371]. Неабыякава ўспрымаецца інфармацыя аб тыпалогіі культуры, ролі мовы (як індыкатара культуры нацыі) у сучаснай культурнай прасторы, выкліках і пагрозах для нацыянальнага культурнага развіцця.

Цікавасць слухачоў адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі да тэарэтыка-метадалагічных аспектаў культуры і культурнага развіцця, праведзенай Інбелкультам у 2013—2014 гг., пацвярджаецца данымі сацыялагічнага даследавання ў межах навукова-даследчай работы па тэме «Вывучыць патрэбнасці кадраў культуры ў павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы і распрацаваць навукова-практычныя рэкамендацыі па ўдасканаленню сістэмы дадатковай адукацыі дарослых» [3]. Агульны аб'ём выбарачнай сукупнасці склаў 472 рэспандэнты. З апытаных слухачоў 45,8 % лічаць, што павышэнне кваліфікацыі, у першую чаргу, павінна быць накіравана на пашырэнне іх кругагляду, фарміраванне гуманістычнага светапогляду. Кантрольнае інтэрв'ю паказала, што ў сваёй практычнай дзейнасці рэспандэнты абапіраюцца на мясцовыя традыцыі і іх адраджэнне, вывучаюць нацыянальную спецыфіку рэгіёнаў і імкнуцца распрацоўваць розныя культурныя праекты, накіраваныя на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны і развіццё культурнага турызму. Ідэалагічны складнік прысутнічае ў патрыятычным выхаванні моладзі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і фарміраванні светапогляду з апорай на экалогію культуры і гуманізм як аснову жыццядзейнасці нацыі.

У гэтым кантэксце паказальна, што 37,9 % рэспандэнтаў упэўненыя (яшчэ 36,7 % лічаць магчымым), што важным з'яўляецца асвятленне ў праграмах праблем развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва, культурнай спадчыны на сучасным этапе ў кантэксце глабалізацыі сусветнай культурнай прасторы і ўваходжання Беларусі ў сусветны гісторыка-культурны працэс. Актуальным аспектам стала фарміраванне агульнакультурнай кампетэнтнасці, цэласнасці бачання, рэфлексіі і ацэнкі свету.

На думку 46,6 % кіраўнікоў устаноў культуры, апытаных у час сацыялагічнага даследавання, павышэнне кваліфікацыі, у першую чаргу, павінна быць накіравана на пашырэнне кругагляду і ўзмацненне тэарэтычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці (з гэтай пазіцыяй згодны 41,4 %). Гэта сведчыць аб разуменні кіраўнікамі асноўнай місіі культурнай дзейнасці і адказным падыходзе да дадатковай адукацыі, неабходнасці ўзмацнення тэарэтычнай падрыхтоўкі, пашырэння кругагляду слухачоў і фарміравання гуманістычнага светапогляду.

На нашу думку, нароўні з практыкаарыентаваным складнікам у сістэме ДАД павінен прысутнічаць і тэарэтычны складнік. Тэарэтычная падрыхтоўка дапамагае развіццю здольнасці да творчага ўспрымання тэндэнцый, сімвалаў, духоўных феноменаў нацыянальнай і сусветнай культуры. Гэта дае магчымасць спецыялістам сферы культуры авалодваць сістэмай ведаў, якая адлюстроўвае культурна-гістарычнае развіццё краіны як адзіны інтэграцыйны працэс.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Ивченко, В.* Белорусская культура в изменяющемся мире / В. Ивченко // Культура Беларусі : рэаліі сучаснасці : Нацыянальная культура ў зменлівым свеце : матэрыялы IV Міжнар. завочнай навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2015. — С. 4—9.
2. *Ивченко, В.* Музей в структуре арт-рынка / В. Ивченко // Культура Беларусі : рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 12—13 чэрвеня 2012 г.) / ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; рэдкал.: І.І. Крук (гал.рэд.), А.А. Галкін, І.Р. Голубева. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2012. — С. 364—371.
3. Изучить потребности кадров культуры в повышении квалификации и переподготовке и разработать научно-практические рекомендации по совершенствованию системы дополнительного образования взрослых : науч.-исслед. работа / ГУО «Институт культуры Беларуси». — Гос. реестр НИОКР(Т)Р. — № регистрации: 20132641. — Дата регистрации: 24.12.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ